**Шаура Р.Ф., прафесар**

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА ЯК ПРАБЛЕМА ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ СТУДЭНТАЎ

Ажыццяўленне вучэбнага працэсу на завочным аддзяленні спецыялізацыі "народныя рамёствы" выклікае шэраг пытанняў метадычнага і арганізацыйнага характару. Завочнае навучанне — адна з формаў набыцця студэнтамі ўменняў і навыкаў у прафесійнай галіне шляхам у большай ступені самастойнай дзейнасці. Прысутнасць навучэнцаў два разы на год у вучэбнай установе ў перыяд сесій, непрацяглыя кантакты з выкладчыкамі падчас лекцый і практычных заняткаў, нават здачы экзаменаў, залікаў, мала мяняюць асноўны прынцып навучання — прынцып самастойнай вучэбнай дзейнасці студэнтаў. Якраз студэнты спецыялізацый, якія паводле сваёй спецыфікі маюць сувязь з творчым працэсам, і сутыкаюцца з праблемамі вучэбнага, метадычнага і арганізацыйнага плана. Так, забяспечыць правядзенне педагагічнай практыкі, выкананне студэнтамі заданняў (па малюнку, жывапісе, кампазіцыі, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве) без пастаяннага кіраўніцтва з боку выкладчыкаў, іх кансультацыйнай дапамогі на завочнай форме навучання аказваецца зусім не простым. У гэтым выпадку значную ролю павінны адыгрываць спецыяльныя методыкі па ўсіх накірунках праграмы, арыентаваныя на завочнае навучанне.

Сёння на большасці спецыялізацый Беларускага універсітэта культуры прадугледжана атрыманне выпускнікамі дадатковай кваліфікацыі — выкладчыка спецыяльных дысцыплін. Гэта вельмі важна для спецыялістаў сферы культуры. Такая кваліфікацыя дазваляе вырашаць пытанне працаўладкавання, дае магчымасць працаваць і па сумяшчальніцтве на педагагічнай ніве. Таму ў вучэбныя планы ўводзяцца пашыраныя курсы па педагогіцы, методыцы выкладання спецыяльных дысцыплін. Прадугледжана педагагічная практыка, што замацоўвае тэарэтычныя веды ў канкрэтнай педагагічнай дзейнасці.

Перад педагагічнай практыкай на 4 курсе, у час экзаменацыйнай сесіі, студэнтам чытаюць курс лекцый па методыцы выкладання спецыяльных дысцыплін. Праводзіцца ўстановачная канферэнцыя, вызначаюць кіраўнікоў практыкі ад кафедры. На канферэнцыі асаблівую ўвагу звяртаюць на змест праграмы практыкі, спосабы яе рэалізацыі. Пры размеркаванні студэнтаў на практыку кафедра абавязана ўлічваць месца, характар працоўнай дзейнасці завочнікаў. Ад праходжання педагагічнай практыкі, напрыклад, можна вызваляць студэнтаў, якія працуюць настаўнікамі сярэдніх агульнаадукацыйных школ альбо вучылішчаў па профілі будучай спецыяльнасці. Другая група студэнтаў, занятая ў вучэбна-выхаваўчых установах (школах-інтэрнатах, дашкольных выхаваўчых установах, цэнтрах эстэтычнага выхавання і г.д.), праходзіць практыку па месцы пражывання без адрыву ад вытворчасці. Кантроль за праходжаннем практыкі, выкананнем праграмы ў такім выпадку рэалізуе кіраўніцтва адпаведнай навучальнай установы. Пасля заканчэння практыкі студэнты падаюць свайму кіраўніку ад кафедры неабходную дакументацыю, кіраўнік праводзіць гутарку з кожным студэнтам. У выніку з'яўляецца заключэнне пра допуск іх на заключную, справаздачную канферэнцыю.

Студэнты завочнай формы навучання, не ўключаныя паводле працоўнай дзейнасці ў педагагічны працэс, праходзяць практыку ў два этапы. Першы з іх азнаямляльны, без адрыву ад вытворчасці па месцы пражывання, на 4 курсе; другі асноўны, замацавальны (9 семестр). Пажадана было б, каб асноўную педагагічную практыку студэнты праходзілі ў базавых установах Беларускага універсітэта культуры ў перыяд сесіі, прычым пад кіраўніцтвам выкладчыкаў спецыяльнай кафедры. Студэнты, што пражываюць, працуюць у Мінску, праходзяць педагагічную практыку ў школах, іншых навучальных установах пад кіраўніцтвам педагогаў спецыяльнай кафедры. Гэта забяспечвае метадычную падтрымку практыкантаў, кантроль за выкананнем праграмы практыкі.

Дапамогу ў арганізацыі практыкі, паспяховым праходжанні яе завочнікам аказваюць метадычныя распрацоўкі, указанні,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможнікі і інш. Выдадзеныя асобнымі брашурамі ў пэўнай колькасці экзэмпляраў, яны могуць выкарыстоўвацца студэнтамі, якія праходзяць педагагічную практыку па-за кіраўніцтвам ад нашага універсітэта.

Падрыхтоўка справаздачнай дакументацыі пасля заканчэння практыкі, удзел у рабоце выніковай канферэнцыі, выступленні кіраўнікоў, практыкантаў з крытыкай недахопаў, асвятленнем станоўчых бакоў педагагічнай дзейнасці будучых спецыялістаў садзейнічаюць фарміраванню ў студэнтаў трывалых ведаў па методыцы, тэхніцы, тэхналогіі выкладчыцкага майстэрства. Тут адбываецца асэнсаванне ўсіх нюансаў, магчымых пралікаў, памылак, пошукаў, знаходак. На выніковай канферэнцыі вызначаюцца агульныя характэрныя недахопы ў рабоце педагога-пачаткоўца, што адыгрываюць значную ролю ў фарміраванні прафесійных якасцей.

З'яўляючыся істотным кампанентам навучальнага працэсу, педагагічная практыка, такім чынам, садзейнічае фарміраванню патрэбных якасцей спецыяліста па народных рамёствах. Гэтыя якасці вызначаюць будучую прафесійную дзейнасць студэнта-завочніка.

**Чаплыгіна Т.І.**, ст.выкладчык
**Стрыжонак І.М.**, ст.выкладчык

## АРГАНІЗАЦЫЯ І МЕТОДЫКА ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ НЕ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Завочная сістэма навучання дае добрую тэарэтычную падрыхтоўку, садзейнічае павышэнню кваліфікацыі. Праўда, значная колькасць тых, хто паступае на факультэт завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры, працуе не па сваёй спецыяльнасці. Адсутнасць такога вопыту работы перашкаджае гэтым студэнтам асвойваць спецыяльныя дысцыпліны. Так, пасля анкетавання высветлілася: існуе сувязь паміж характарам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ